**УДК 371.13 (043.2)**
**ББК 74 р**
**А 28**

**Рецензенты:** доктор психологических наук, профессор, действительный член БелАО Л.А. Кандыбович; доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки РБ А.П. Сманцер

**Редакционная коллегия:** Мирзаянова Л.Ф. (главный редактор), Бородина Е.И., Вакульчик И.В. (отв. редактор 2 части сборника), Малиновский Е.Л., Маслов Ю.В., Пономарева Е.И., Сотник Н.М. (отв. редактор 2 части сборника), Шавель О.М.

А 28 **Адаптация к профессиональной деятельности как психолого-педагогическая проблема: методологические основания, пути и способы решения:** Материалы Междунар. науч.-практ. конф. В 4 ч. Ч. 2 / Ред. кол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.). – Барановичи: БГВПК, 2001.– 200 с.

**ISBN 985-6616-31-X**
**ISBN 985-6616-29-8 (часть 2)**

В сборнике содержатся статьи участников Международной научно-практической конференции "Адаптация к профессиональной деятельности как психолого-педагогическая проблема: методологические основания, пути и способы решения". В статьях отражено современное состояние проблемы, дано методолого-теоретическое и практическое обоснование путей и средств ее решения на современном этапе развития общества, представлен методический опыт работы по использованию средств повышения адаптированности обучаемых и специалистов разных категорий.

Материалы сборника предназначены научным коллективам, преподавателям средних и высших учебных заведений, аспирантам, студентам.

**ISBN 985-6616-31-X**
**ISBN 985-6616-29-8 (часть 2)**

**УДК 371. 13 (043.2)**
**ББК 74 р**
**А 28**

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2001

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 7. ПРЕЕМСТВЕННОСТЬ В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОБРАЗОВАТЕЛЬНО-ВОСПИТАТЕЛЬНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ КАК ФАКТОР АДАПТАЦИИ ОБУЧАЮЩИХСЯ К НОВЫМ УСЛОВИЯМ ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТИ

## ПЕРАЕМНАСЦЬ ПРАФЕСІЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ У СІСТЭМЕ "ПЕДАГАГІЧНЫ КАЛЕДЖ – УНІВЕРСІТЭТ"

А.І. Андарала

Беларусь, г. Мінск

Падрыхтоўка настаўнікаў для пачатковай школы ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца педагагічнымі каледжамі і універсітэтамі. Як сведчыць практыка, больш за 80% выпускнікоў педкаледжа працягваюць сваю прафесійную адукацыю на завочных аддзяленнях факультэтаў пачатковых класаў у вышэйшых навучальных установах. Наяўнасць у гэтай катэгорыі першакурснікаў-завочнікаў пэўных прафесійных ведаў, уменняў і педагагічнага вопыту абумовіла неабходнасць унясення істотных змен у структуру і змест традыцыйнай завочнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў.

Першы крок у вырашэнні гэтай праблемы быў зроблены ў 1985 – 1986 навучальным годзе, калі на завочных аддзяленнях факультэтаў пачатковых класаў быў уведзены ў дзеянне спецыяльны вучэбны план. Згодна гэтаму плану для асоб, якія маюць сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю, тэрмін навучання скарачаўся з пяці да трох з паловай гадоў. Фактычна навучанне гэтай катэгорыі студэнтаў-завочнікаў ператварылася ў своеасаблівую форму павышэння кваліфікацыі па спецыяльнасці, атрыманай у педагагічным каледжы.

Пераход на скарочаны тэрмін навучання паклаў пачатак двухузроўневай сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў для пачатковай школы "педагагічны каледж – універсітэт".

Першай ступенню прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў з'яўляецца педагагічны каледж, дзе

навучанне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Дзяржаўным адукацыйным стандартам сярэдняй спецыяльнай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці 0312 – "Выкладанне ў пачатковых класах". На першай ступені выпускнік каледжа павінен ажыццяўляць свае прафесійныя функцыі на ўзроўні майстра. Гэта настаўнік, які валодае тэорыяй і методыкай навучання і выхавання, падрыхтаваны да свядомай педагагічнай дзейнасці.

Другой ступенню з'яўляецца навучанне на завочных аддзяленнях факультэтаў пачатковых класаў вышэйшых навучальных устаноў. Падрыхтоўка пры гэтым ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Дзяржаўным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці П 04.02.00 – "Педагогіка і методыка пачатковага навучання". На другой ступені выпускнік універсітэта – спецыяліст з высокім узроўнем прафесійнай дзейнасці.

Адной з асноўных умоў эфектыўнага функцыянавання двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў, на наш погляд, з'яўляецца ўстанаўленне пераемнасці паміж названымі вышэй адукацыйнымі стандартамі.

Пераемнасць мы разглядаем як сістэму, што ўключае ў сябе шэраг структурных элементаў, адпавядаючых асноўным кампанентам навучання (зместу, метадам, формам і сродкам навучання). Выходзячы з гэтага, правамерна гаварыць аб пераемнасці ў змесце адукацыі, пераемнасці ў формах і сродках навучання.

Функцыянаванне двухузроўневай сістэмы выклікае неабходнасць хутчэйшага стварэння новых пераемнаабумоўленых вучэбных планаў, перагляду зместу вучэбных праграм, формаў, метадаў і сродкаў падрыхтоўкі спецыялістаў як на першай, так і на другой ступені прафесійнага станаўлення настаўніка пачатковых класаў.

Каб пацвердзіць наша меркаванне, быў праведзены параўнальны аналіз зместу вучэбных праграм па педагогіцы, якія дзейнічаюць сёння ў педагагічных каледжах і ВНУ. Гэта вучэбная дысцыпліна адыгрывае вядучую ролю ў сістэме прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў любой спецыяльнасці. Аналіз дазваляе зрабіць вывад, што праграма па педагогіцы на першай ступені педагагічнай адукацыі значна перагружана тэарэтычным матэрыялам, што робіць яе падобнай да адпаведнай праграмы ВНУ. На нашу думку, у праграму педагагічнага каледжа павінен быць уключаны толькі той аб'ём тэарэтычнага матэрыялу, якім навучэнцы могуць авалодаць свядома, грунтоўна і які ім будзе патрэбны ў іх практычнай дзейнасці.



Адзін з найбольш рэальных шляхоў паспяховага рашэння разглядаемай праблемы бачыцца ў стварэнні навукова-даследчай лабараторыі "Педагагічны каледж – універсітэт". Супрацоўнікі гэтай лабараторыі сумесна з педагагічнымі калектывамі ВНУ і каледжаў, зыходзячы з бесперапыннасці адукацыі настаўніка і пераемнасці яго падрыхтоўкі на розных ступенях, павінны вызначыць патрабаванні да зместу і ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў па псіхолага-педагагічнаму і прадметнаму блоках для кожнай з дзвюх ступеняў прафесійнай адукацыі настаўнікаў пачатковых класаў.

Вызначэнне зместу адукацыі для другой ступені прафесійнай адукацыі настаўнікаў пачатковых класаў у сістэме "педагагічны каледж – універсітэт" павінна быць накіравана на:

– паглыбленне і сістэматызацыю ведаў, атрыманых у каледжы, на новай тэарэтычнай і практычнай аснове;

– упарадкаванне і крытычнае асэнсаванне педагагічнага вопыту, які ёсць у студэнтаў.

Адным з асноўных крытэрыяў адбору зместу адукацыі для навучання выпускнікоў педагагічных каледжаў на завочных аддзяленнях ВНУ з'яўляецца іх рэальны ўзровень падрыхтоўкі. Для яго вывучэння могуць быць выкарыстаны анкетаванне, метад экспертнай ацэнкі, субяседаванне з абітурыентамі.

## ОБУЧАЮЩЕ-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИЙ ПРИНЦИП КАК СРЕДСТВО ФОРМИРОВАНИЯ АДАПТИВНОЙ СОСТАВЛЯЮЩЕЙ КОМПЕТЕНЦИИ БУДУЩЕГО СПЕЦИАЛИСТА

А.Н. Братенникова, Е.И. Василевская, Ф.Ф. Лахвич

Беларусь, г. Минск

В последнее время при оценке эффективности образовательных процессов часто оперируют понятием "компетенция". Более того, данная характеристика фигурирует в качестве одного из обязательных элементов структуры образовательных стандартов средних и высших учебных заведений [1]. Под компетенцией понимают категорию, связанную с умением устанавливать связи между знаниями и ситуацией или, в более широком смысле, способность специалиста находить процедуру (знания и действия), подходящую для решения конкретной проблемы [2].